# Водгук

на дысертацыйнае даследаванне Панова С.В.
«Развіццё гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь у 1991 – 2020 гг. (на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі)», прадстаўленае на атрыманне вучонай ступені доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі

Актуальнасць аўтарскага гісторыка-педагічнага даследавання абумоўлена мэтазгоднасцю сістэматызацыі і абагульнення больш чым 30-гадовага вопыту станаўлення школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь. Вызначальным фактарам у гэтым працэсе з'яўляецца афармленне ў Рэспубліцы Беларусь дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, накіраванай на замацаванне сродкамі школьнай гістарычнай адукацыі беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці. Згаданы фактар абумоўлівае своечасовасць фарміравання нацыянальна-культурнага і сацыяльна-аксіялагічнага зместу прадметнага навучання з улікам нацыястваральнага патэнцыялу гісторыі Беларусі.

Школьная гістарычная адукацыя пазіцыяніруецца дактарантам як шматкампанентная комплексная педагагічная сістэма ў адзінстве яе разумення як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы і сацыягуманітарнай з'явы, што забяспечвае комплекснасць даследавання. Аўтарская ідэя заключаецца ў канцэптуалізацыі працэса даследавання развіцця школьнай гістарычнай адукацыі праз навукова-тэарэтычнае вызначэнне міждысцыплінарных канцэптаў гістарычнай памяці, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, нацыянальнай ідэі, грамадзянскай нацыі, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства, патрыятызма і грамадзянскасці пры іх рэалізацыі ў змесце школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры. Такая канцэптуалізацыя актуалізавана Канцэпцыяй нацыянальнай бяспекі Рэспублікі Беларусь (2010) у сувязі з стратай часткай грамадзян традыцыйных маральных каштоўнасцей і арыентыраў, спробамі разбурэння нацыянальных духоўна-маральных традыцый і неаб'ектыўнага перагляду гісторыі, якія закранаюць дадзеныя каштоўнасці і традыцыі.

Канцэптуальныя асновы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі, якія даследуюцца дысертантам, акрамя вышэзгаданых канцэптаў, уключаюць у сябе: мэты і задачы; місію; функцыянал; прынцыпы канструявання зместу вучэбнага гістарычнага матэрыялу; дыдактычную структуру прадметнага навучання; канцэпты акадэмічнай гістарычнай навукі і яе падыходы да разумення грамадска-гістарычнага працэсу; агульнапедагагічныя канцэпцыі зместу адукацыі і падыходы да падрыхтоўкі выпускніка агульнаадукацыйнай школы па гісторыі; прадметна-гістарычныя падыходы да дыдактычнага канструявання прадметнага зместу; падставы для адбору зместу школьнай гістарычнай адукацыі.

Навуковая навізна дысертацыйнага даследавання Панова С.В. заключаецца ў наступным. Дысертантам удакладнена структура школьнай гістарычнай адукацыі ў складзе канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыянальна-функцыянальнага, зместава-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў у сукупнасці з адпаведнымі кампанентам фактарамі. Ахарактарызаваны этапы развіцця школьнай гістарычнай адукацыі з улікам гістарычных дат (1991, 1998, 2009, 2015, 2022 гг.), якія сведчаць аб вызначэнні і рэалізацыі яе канцэптуальных асноў у канцэпцыях 1991, 2009, 2022 гг., у адукацыйных стандартах 1998, 2009, 2018 гг., у пяці пакаленнях вучэбнай літаратуры па сусветнай гісторыі і гісторыі Беларусі.

Дактарантам вызначаны комплексны характар рэалізацыі ў змесце і структуры школьнай гістарычнай адукацыі шэрагу падыходаў як комплексных педагагічных сродкаў. Гэта падыходы акадэмічнай гістарычнай навукі (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны) да разумення грамадска-гістарычнага працэсу; агульнапедагагічныя падыходы (культуралагічны і кампетэнтнасны) да падрыхтоўкі выпускніка агульнаадукацыйнай школы па гісторыі; прадметна-гістарычныя падыходы (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны) да дыдактычнага канструявання зместу адукацыі з улікам яго ведчага, дзейнаснага, эмацыянальна-каштоўнаснага кампанентаў.

Распрацаваная дысертантам структурна-зместавая мадэль гісторыка-педагагічнага даследавання працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі з'яўляецца сродкам яе вывучэння як інстытуцыянальна-ведамаснай сістэмы з улікам адукацыйных стандартаў, вучэбных праграм і літаратуры і як сацыягуманітарнай з'явы, абумоўленай яе прыналежнасцю да грамадскіх навук, пераўтварэннямі ў сістэме сацыяльна-гуманітарнай адукацыі, існуючымі метадалагічнымі падыходамі акадэмічнай гісторыі і яе прынцыпамі, выкарыстаннем міждысцыплінарных канцэптаў сацыялогіі, паліталогіі, культуралогіі.

Дысертантам удакладнены прынцыпы дыдактычнага канструявання зместу школьнай гістарычнай адукацыі вучэбнага, у прыватнасці, антрапалагізацыі (абумоўлівае вывучэнні ролі чалавечага фактару ў гісторыі), культурна-гістарычнага асяроддзя (прадугледжвае трансляцыю дасягненняў ў галіне матэрыяльнай і духоўнай культуры, ідэй і каштоўнасных арыентацый чалавека ў гісторыі з вызначэннем пераемнасці з сучаснасцю), гістарычнай дыялагічнасці (арганізацыі камунікацыі вучняў з аддаленымі ад перыяду іх жыцця аб'ектамі вывучэння). Дысертантам таксама ўдакладнены функцыі, у прыватнасці, кансалідуючая (папярэджванне канфрантацыйнасці ў міжасобасных і міжпакаленных адносінах на аснове талерантнага стаўлення да адрознага ад свайго меркавання, забяспечэнне кансалідацыйнай ролі гістарычнай памяці), кансерватыўна-пераемная (захаванне гістарычнай памяці і выхаванне беражлівых адносін да месцаў памяці), контрнаступальная (супрацьстаянне фальсіфікацыі і рэвізіі найважнейшых падзей сусветнай і айчыннай гісторыі з улікам фарміравання крытычнага мыслення).

Дысертацыя з'яўляецца самастойным завершаным арыгінальным гісторыка-педагагічным даследаваннем, якое сведчыць аб асабістым укладзе аўтара ў тэорыю і практыку школьнай гістарычнай адукацыі. Варта падкрэсліць, што дысертантам на працягу амаль чвэрці стагоддзя падрыхтаваны ў сааўтарстве тры пакаленні школьнай вучэбнай літаратуры па гісторыі Беларусі і вучэбнаму прадмету «Чалавек і свет. Мая Радзіма – Беларусь» з грыфам Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

Прынцыпова новыя вынікі дысертацыі заключаюцца ў комплексным абгрунтаванні канцэптуальных асноў развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь, у т.л. канцэптуалізацыі даследавання праз міждысцыплінарныя канцэпты гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, нацыянальна-культурнай ідэнтычнасці, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства. Выкладзеныя ў дысертацыі навуковыя палажэнні і высновы тэарэтычна абгрунтаваны і маюць практыка-арыентаваны характар.

Вучоная ступень доктара педагагічных навук па спецыяльнасці 13.00.01 – агульная педагогіка, гісторыя педагогікі і адукацыі можа быць прысуджана Панову С.В. за сукупнасць наступных навуковых вынікаў:

– удакладненне структуры школьнай гістарычнай адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь як комплекснай педагагічнай сістэмы з улікам яе інстытуцыянальна-ведамаснага характару і сацыягуманітарнай сутнасці ў складзе канцэптуальна-метадалагічнага, інстытуцыянальна-функцыянальнага, зместава-дзейнаснага, сацыяльна-аксіялагічнага кампанентаў, якія вызначаны ў сукупнасці з адпавядаючымі ім фактарамі, абумоўленымі афармленнем у Рэспубліцы Беларусь дзяржаўнай гістарычнай палітыкі, накіраванай на замацаванне беларускай нацыянальнай канцэпцыі гістарычнага мінулага і беларускай мадэлі гістарычнай памяці;

– сістэматызацыя падыходаў, якія выкарыстоўваюцца ў школьнай гістарычнай адукацыі і прадвызначаюць міждысцыплінарную спецыфіку гісторыка-педагагічнага даследавання: падыходы акадэмічнай гістарычнай навукі (фармацыйны, мадэрнізацыйны, цывілізацыйны) да разумення грамадска-гістарычнага працэсу; агульнапедагагічныя падыходы (культуралагічны і кампетэнтнасны ў іх пераемнасці) пры фарміраванні ў вучняў вопыта творчай дзейнасці і эмацыянальна-каштоўнаснага стаўлення да вывучаемых падзей і іх удзельнікаў з улікам кампетэнцый крэатыўнасці і эмацыянальнай рэгуляцыі; прадметна-гістарычныя падыходы (гісторыка-крыніцазнаўчы, гісторыка-антрапалагічны, гісторыка-аксіялагічны) да дыдактычнага канструявання зместу;

– канструяванне інструментальнай мадэлі гісторыка-педагагічнага даследавання працэсу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў 1991–2022 гг.;

– распрацоўка чатырохэтапнай перыядызацыі працэсу развіцця ў Рэспубліцы Беларусь школьнай гістарычнай адукацыі у 1991–2022 гг. на комплекснай падставе вызначэння яе канцэптуальных асноў (канцэпцыі 1991, 2009, 2022 гг.), распрацоўкі адукацыйных стандартаў (1998, 2009, 2018 гг.),

падрыхтоўкі пяці пакаленняў вучэбнай літаратуры, рэалізацыі культуралагічнага і кампетэнтнаснага (з 2015 г.) падыходаў, нарматыўна-прававога афармлення дзяржаўнай гістарычнай палітыкі ў Рэспубліцы Беларусь;

– комплекснае выяўленне тэндэнцый развіцця школьнай гістарычнай адукацыі ў іх сукупнасці, звязаных з эвалюцыяй канцэптуальнага мэтавызначэння ад кансерватыўнага захавання вузкапрадметна-ведавай прыярытэтнасці да арыентаванасці на развіцце вучня пры актуалізацыі асабовых, метапрадметных і прадметных вынікаў фарміравання кампетэнцый; з пераемнасцю дыдактычнага канструявання зместу пры ўліку прынцыпаў філасофскага абагульнення і дыялагічнай інтэрпрэтацыі гістарычных фактаў, антрапалагізацыі і культурна-гістарычнага асяроддзя; з цыклічнасцю ў рэалізацыі канцэнтрычнага і лінейнага прынцыпаў структуравання зместу навучання; са зменамі ў функцыянале, актуалізаванымі захаваннем гістарычнай памяці і яе кансалідацыйнай роллю, супрацьстаяннем фальсіфікацыі найважнейшых падзей, выкарыстаннем канкрэтна-гістарычных аналагаў паводзін чалавека ў гісторыі, абраных у якасці маральных арыенціраў;

– характарыстыка міждысцыплінарных канцэптаў гістарычнай памяці, нацыі і нацыянальнай ідэі, беларускай дзяржаўнасці, традыцыйных каштоўнасцей беларускага грамадства праз іх навукова-тэарэтычнае азначэнне прадстаўнікамі навукова-педагагічнага супольніцтва і рэалізацыю ў змесце школьнай вучэбнай гістарычнай літаратуры;

– вызначэнне патэнцыялу развіцця школьнай гістарычнай адукацыі з улікам ажыццяўлення вучэбным прадметам «Гісторыя Беларусі» нацыястваральнай ролі і каштоўнасных арыентацый вучняў, актуалізацыяй светапоглядна-выхаваўчай функцыі, удакладненнем падстаў для адбору зместу адукацыі, звязаных з яе мэтавызначэннем, дзейнасным і эмацыянальна-каштоўнасным кампанентамі, удакладненнем зместавых ліній, пераадоленнем празмернай факталагічнасці зместу і інтэграцыяй вучэбнага матэрыялу па гісторыі Беларусі і сусветнай гісторыі.

Навуковы кансультант,
Старшыня Пастаяннай камісіі
Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага
сходу Рэспублікі Беларусь
па адукацыі, культуры і навукі,
доктар гістарычных навук, прафесар,
член-карэспандэнт НАН Беларусі І.А. Марзалюк

Отдел по защите государственных секретов и кадровой работе

ВЕРНО
Начальник отдела по защите
государственных секретов
и кадровой работе

30.10.2023